паняццяў, думак, вобразаў" [3, с.21]. Напрыклад: Глядзіць Міхал… што за хвароба? Ён не адзін – іх дзве асобы: Адзін Міхал – **нядошлы**, **млявы**, Другі – **здаровы** і **рухавы**! Адзін **ляжыць**, другі **вандруе** (6, 278).

Антонімы выкарыстоўваюцца ў паэтычнай мове Якуба Коласа як сродак стварэння кантрасту, рэзкага супрацьпастаўлення з'яў, дзеянняў і прымет.

ЛІТАРАТУРА

1 Тут і далей у дужках указваецца том і старонка па выданні: Колас Якуб. Збор твораў у 14 тамах. Мн.: Маст. літ. , 1972 – 1974.

2 Юрэвіч, А.К. Стылістыка беларускай мовы / А.К. Юрэвіч – Мн.: Выш. шк., 1992. – 286 с.

3 Сцяцко, П.У. Слоўнік лінгвістычных слоўнікаў / П.У. Сцяцко, М.Ф. Гуліцкі, Л.А. Антанюк – Мн.: Выш. шк., 1990. – 222.

***К.Л.Хазанава (Беларусь)***

## ПРА АДЗІН ТЫП БЕЛАРУСКІХ ЗАГАДАК

Загадкі ўяўляюць сабой вобразна-паэтычнае апісанне пэўнага прадмета ці з'явы. Яны выпрабоўваюць кемлівасць адгадвальніка і з'яўляюцца духоўнай спадчынай нам ад дзядоў і прадзедаў. Разам з тым загадкі – гэта моўныя сродкі, і як моўныя адзінкі яны маюць пэўную структуру. У працэсе даследавання сінтаксічных адметнасцей беларускіх загадак увагу на сябе звяртаюць загадкі са структурай аднасастаўных сказаў.

Структура аднасастаўнага сказа з'яўляецца даволі пашыранай сярод беларускіх загадак. Загадкі, што маюць канструкцыю аднасастаўных сказаў, з'яўляюцца асобнай групай беларускіх загадак, і іх мэтазгодна прааналізаваць адпаведна класіфікацыі аднасастаўных сказаў, прынятай у беларускім мовазнаўстве [1, с.210].

Аднасастаўнымі сказамі з'яўляюцца "сказы з адным галоўным членам (суданосным ці з выказнікам, ці з дзейнікам двухсастаўнага сказа, але не ідэнтычным яму), які сумяшчае ў сабе значэнне лагічнага суб'екта і прэдыката" [1, с.210]. У залежнасці ад формы выражэння галоўнага члена загадкі са структурай аднасастаўнага сказа можна падзяліць на дзеяслоўныя і іменныя. У сваю чаргу, дзеяслоўныя аднасастаўныя сказы паводле адносін дзеяння да яго вытворцы бываюць чатырох тыпаў: пэўна-асабовыя, няпэўна-асабовыя, абагульнена-асабовыя, безасабовыя. Асобна выдзяляюцца інфінітыўныя сказы.

Мэтай нашага даследавання з'яўляецца аналіз беларускіх загадак са структурай аднасастаўных дзеяслоўных сказаў. Пры гэтым зазначым, што пад увагу нашага аналізу трапілі не толькі загадкі са структурай простага аднасастаўнага сказа, але і загадкі, што па структуры ўяўляюць сабой складаны сказ, часткі якога маюць канструкцыю аднасастаўнага сказа.

Падзел дзеяслоўных аднасастаўных сказаў заснаваны на суадносінах семантыкі сказаў з формай выражэння галоўнага члена. У пэўна-асабовым аднасастаўным сказе галоўны член выражаецца "дзеясловам у асабовай форме, што ўказвае на пэўную дзеючую асобу" [1, с.212]. У загадках асноўны спосаб граматычнага выражэння галоўнага члена пэўна-асабовых сказаў – форма 1 асобы адзіночнага ліку цяперашняга і будучага простага часу абвеснага ладу: *Рассцялю радзюжку, пасыплю гарошку і акраец хлеба палажу; Рассцялю дзяружку, пасыплю гарошку крошку, палажу акрайчык хлеба* (неба, зоркі, месяц) [2, с.27]. У загадках такога сінтаксічнага тыпу сама форма галоўнага члена ўказвае на ўтваральніка дзеяння. Таму граматычна выражаны дзейнік тут не з'яўляецца патрэбным.

У адрозненне ад загадак са структурай двухсастаўнага сказа, дзе дзейнік выражаецца асабовым займеннікам (дарэчы, такія загадкі – з'ява рэдкая), аднасастаўныя пэўна-асабовыя загадкі засяроджваюць увагу на дзеянні. У гэтым – стылістычная перавага пэўна-асабовых аднасастаўных канструкцый над двухсастаўнымі. Пільная ўвага да дзеяння стварае дынамічнасць паведамлення. Асабліва гэта адносіцца да загадак са структурай складанага сказа, якія маюць некалькі простых частак, кожная з якіх уяўляе сабой пэўна-асабовы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

аднасастаўны сказ. Прыгадаем яшчэ варыянты беларускіх загадак пра неба, зоркі, месяц: *Пасцялю дзяружку, пасыплю гарошку, пакладу кулідку хлеба; Пасцялю дзяружку, пасыплю гарошку да палажу лусту хлеба; Пасцялю рагожку, насыплю гарошку, крайчык хлебца пакладу; Палажу кажух, пасыплю гарох, палажу бохан хлеба* [2, с.28].

З дапамогай канструкцыі пэўна-асабовых сказаў уся ўвага ў загадках канцэнтруецца на дзеянні. Пры аб’яднанні некалькіх падобных сінтаксічных структур у межах аднаго сказа загадкі набываюць асаблівую экспрэсію: *Еду, еду на сівым дзеду, сухалінай паганяю, на смерць паглядаю* (водная паверхня) [2, с.33]; *Хаджу па сене ды й не шамаю* (цень) [2, с.54]; *На агне пакажуся, у вадзе схаваюся* (смала) [2, с.68].

Часта ўжыванне некалькіх пэўна-асабовых сказаў у загадцы спалучаецца з паўтарэннем галоўных членаў, што павялічвае канататыўныя ўласцівасці загадак гэтай канструкцыі: *Мяту, мяту – не вымету, нясу, нясу – не вынесу* (цень) [2, с.53].

Адметнасць некаторых пэўна-асабовых загадак у тым, што ў іх патрабуецца адгадаць якраз аб’ект дзеяння, той прадмет ці з’яву, які падвяргаецца дзеянню, названаму галоўным членам: *Нясу крывулічку, ды ў тую вулічку* (лыжку ў рот) [2, с.244].

Часта ў пэўна-асабовых загадках вельмі падрабязна апісваюцца дзеянні, што робяцца з загаданым прадметам: *Пайду ў лес, выламлю цялеш, з гэтага целяша выберу два каўша, дзве пласціны, карэц і шыла канец* (жолуд) [2, с.68]. Старажытнасць такіх загадак пацвярджае і наяўнасць аналагічных варыянтаў у рускім і ўкраінскім фальклоры, на што ўказвае К.П.Кабашнікаў: *Выйду в лес без топора, без долота, высеку две лодки ездовых, две доски половых, горшку покрышку, половнику ручку; Поїду в ліс, вирублю теліш, із того теліша ізроблю два човни, два столи, шило і покришку* [3, с.125].

Яшчэ адным спосабам выражэння галоўнага члена ў загадках, якія ўтрымліваюць пэўна-асабовыя сказы, з’яўляецца форма дзеяслова 1 асобы множнага ліку цяперашняга і будучага простага часу. Часта сустракаюцца варыянты загадак, адрозныя менавіта лікам дзеяслова галоўнага члена. Напрыклад, ужо ўзгаданая загадка пра цень мае варыянт: *Мяцём, мяцём – не вымецем, носім, носім – не вынесем* [2, с.53].

Усе адзначаныя формы дзясловаў не патрабуюць абавязковага называння суб’екта дзеяння. Ужо сама марфалагічная форма галоўнага члена пэўна-асабовага сказа ўказвае на вытворцу дзеяння, у адрозненне, напрыклад, ад дзеяслоўных форм прошлага часу. Такая сітуацыя склалася гістарычна і ўказвае на старажытнае паходжанне загадак з падобнай структурай. Яшчэ ў старажытнарускіх помніках былі пашыраныя пэўна-асабовыя сказы, дзе адсутнічаў дзейнік, а ў дзеяслове выражалася пэўная асоба. Распаўсюджанасць гэтых сказаў у старажытнарускай мове абумоўлівалася “адсутнасцю займеннікаў 1 і 2 асобы ў ролі дзейнікаў” [4, с.371].

Ёсць сярод загадкавых сінтаксічных канструкцый няпэўна-асабовыя сказы, дзе галоўны член выражаецца формай дзеяслова 3 асобы множнага ліку цяперашняга, будучага і прошлага часу і ўказвае на дзеянне, якое выконваюць няпэўныя асобы: *Білі мяне, білі, білі, калацілі, на полі цягалі, клоччамі ірвалі, на ключ запіралі і на стол саджалі* (лён) [5, с.313]. У такіх загадках дзеючая асоба не называецца і ўсведамляецца няпэўна, што падкрэсліваецца формай 3 асобы дзеяслова. Часцей такія загадкі маюць структуру складанага сказа, у простых частках якога маецца некалькі даданых членаў. Даданыя члены і ўтвараюць мінімальны кантэкст, у якім найбольш праяўляюцца ўласцівасці формы галоўнага члена. Будова няпэўна-асабовых сказаў, як і пэўна-асабовых, акцэнтуе ўвагу на дзеянні, але, у адрозненне ад апошніх, няпэўна-асабовыя канструкцыі выкарыстоўваюцца ў загадках, дзе апісваецца нейкая калектыўная праца або дзейнасць, якая можа выконвацца ўсімі. Пры гэтым адгадаць зноў патрабуецца аб’ект, які падвяргаецца гэтай дзейнасці.

Калі ў пэўна-асабовых загадках гэты прадмет ці з’ява хаваецца за іншым прадметам ці з’явай, то ў няпэўна-асабовых загадках частым з’яўляецца прамое дапаўненне, выражанае асабовым займеннікам у форме вінанавальнага склону. Такім чынам, няпэўна-асабовыя загадкі – гэта свайго роду рэпліка таго, што патрабуецца адгадаць: *Б’юць мяне палкамі, пнуць мяне камнямі, рэжуць мяне нажамі, за тое мяне глумяць, за што мяне любяць* (хлеб) [5, с.315].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У няпэўна-асабовых загадках паведамленне, канстатацыя рэальнага факта дзеяння намнога важнейшая за канкрэтызацыю дзеяча, да якога ў гэтым сінтаксічным тыпе праяўляецца абыякавасць. У гэтым – камунікатыўна-стылістычная роля няпэўна-асабовых загадак. Апісваецца дзеянне, што выконвае калектыў або выконваюць усе, і паведамленне пра гэта дзеянне – самае важнае: *Па мне паўгода ходзяць, паўгода ездзяць* (балота) [2, с.31]. Неабходна падкрэсліць, што няпэўна-асабовыя загадкі называюць толькі праяўленні чалавечай дзейнасці: *У кішэню жывое имяса кладуць* (рука) [2, с.128]; *Білі мяне і калацілі, а з царом разам усадзілі* (бялізна); *Сякуць, рубаюць, на моры трэскі лятаюць* (адзежу мыюць, б'юць пранікам) [2, с.311].

Сустракаюцца сярод загадак са структурай простага аднасастаўнага сказа абагульнена-асабовыя сказы, галоўны член якіх выражаны дзеясловам у форме 2 асобы адзіночнага ліку цяперашняга ці будучага часу і абазначае дзеянне, якое можа адносіцца да любой асобы: *Нічым хаты не абнясеш* (мора) [2, с.37]. У некаторых загадках такой будовы галоўны член мае формы дзеяслова 2 асобы адзіночнага ліку загаднага ладу: *Каці, каці клубок і не разматаеш* (дарога) [2, с.336]; *Абліжы і зноў улажы* (лыжка) [2, с.245].

Форма 2 асобы дзеяслова з'явілася вельмі прыдатнай у гэтых загадках, бо яна з'яўляецца тыповым сродкам выражэння абагульненасці і дазваляе падкрэсліць, што назіранні адносяцца як бы да любога чалавека. Шляхам выкарыстання формы 2 асобы ў якасці галоўнага члена ў загадках заключаецца своеасабівае запрашэнне да сумесных назіранняў, перажыванняў і нават дзеянняў, а таксама – да ўяўлення сябе дзеячым персанажам загадкі. Таму форма 2 асобы дзеяслова стварае адметную эмацыянальную афарбаванасць загадак, у якіх яна выкарыстоўваецца.

Загадкі, якія па сінтаксічнай канструкцыі з'яўляюцца абагульнена-асабовымі сказамі, апісваюць назіранні, што нарадзіліся з аб'ектыўных асаблівасцей пэўных з'яў і сітуацый: *Цела носіш, косці бросіш, галоўку з'ясі* (лён) [2, с.83]. Такім чынам, у абагульнена-асабовых сказах-загадках захоўваецца засвоены калектыўны вопыт папярэдніх пакаленняў. Такія загадкі ўтрымліваюць вывад з мэтай ахарактарызаваць якую-небудзь з'яву: *Круцішся, верцішся, на ноч павесішся* (цэп) [2, с.209]; *Матчыню скрыню не паднімеш, дочкіну трубку не скатаеш, братнінага коніка не паймаеш* (земля, дарога, вецер) [2, с.30].

Як відаць з прыкладаў, у беларускіх загадках часта адбываецца аб'яднанне некалькіх абагульнена-асабовых частак у адзін складаны сказ. Гэта дазваляе больш дэталёва апісаць сітуацыю, дзеянне ў якой атрымліваецца больш эмацыянальным і выразным. Іншы раз у такой канструкцыі пры галоўных членах амаль адсутнічаюць даданыя члены, што павялічвае дынамізм аповеду: *На плеш капнеш, уставіш, папарыш, дастанеш, папаравіш* (блін) [2, с.238].

Часам сустракаюцца загадкі з будовай безасабовага сказа, галоўны член якіх абазначае "дзеянне ці стан незалежна ад вытворцы дзеяння (ці носьбіта прыкметы)" [1, с.219].

З боку граматычнай семантыкі для такіх загадак характэрна значэнне стыхійнасці, міжвольнасці дзеяння і стану. Сітуацыя, якую абмалёўваюць указаныя загадкі, - вынік дзеяння стыхійных сіл, аб'ектыўных абставін, а не рэальнага суб'екта: *Не стучэла, не гручэла, пад аконца падляцела* (дзень) [2, с.59].

У загадках-безасабовых сказах галоўны член часцей выражаецца асабовым дзеясловам у безасабовым значэнні: *Цякло, цякло і схавалася сцякло; Цякло, цякло і лягло пад шкло* (рака пад лёдам) [2, с.33-34]. Такія загадкі прысвечаны пэўным прыродным з'явам, навакольнаму асяроддзю, пэўным стыхійным сілам, тым з'явам і сітуацыям, якія не маглі быць растлумачаны ў старажытнасці. Таму людская фантазія несвядома і "апранула" загадкі пра некаторыя прыродныя з'явы ў безасабовую форму.

Семантыка-стылістычныя магчымасці безасабовых сказаў абумовілі тое, што ў загадках гэтая канструкцыя выкарыстоўваецца, калі неабходна выдзеліць само дзеянне, а часцей нават стан, безадносна да дзеяча. Таму і асноўнае месца іх ужывання – загадкі пра з'явы прыроды.

Праведзены аналіз некаторых сінтаксічных рыс беларускіх загадак дае падставы адзначыць, што канструкцыя аднасастаўных дзеяслоўных сказаў з'яўляецца даволі прыдатнай для загадак як моўных адзінак. Такая сінтаксічная будова акцэнтуе ўвагу на дзеянні, што стварае дынамізм аповеду, робіць яго экспрэсіўным і дакладна называе



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

неабходныя загадвальніку і разгадвальніку рэаліі. Неабходна асобна заўважыць той факт, што ў большасці выпадкаў у беларускіх загадках некалькі аднасастаўных сказаў аб’ядноўваюцца ў складаны бяззлучнікавы сказ. Спалучэнне простых аднасастаўных сказаў у адным бяззлучнікавым складаным сказе стварае выразнасць і эмацыянальнасць загадак. Нездарма загадкі такой сінтаксічнай будовы сустракаюцца і ва ўкраінскім, і ў рускім фальклоры.

ЛІТАРАТУРА

1 Беларуская граматыка : У 2 ч. / М.В.Бірыла, П.П.Шуба. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. Частка 2: Сінтаксіс. – 1986. – 327 с.

2 Загадкі / склад. М.Я.Грынблат, А.І.Гурскі. Рэд. А.С.Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. – 448 с.

3 Кабашнікаў К.П. Малыя жанры беларускага фальклору ў славянскім кантэксце / К.П.Кабашнікаў. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – 188 с.

4 Иванов, В.В. Историческая грамматика русского языка / В.В.Иванов. – М.: Просвещение, 1983. – 399 с.

5 Беларускі фальклор : хрэстаматыя / склад К.П. Кабашнікаў, А.С.Ліс, А.С.Фядосік, І.К.Цішчанка. – Мінск: Вышэйшая школа, 1985. – 749 с.

***З.У.Шведава (Беларусь)***

## АНДРОНІМЫ XVI – XVII стст. ЯК ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ МАТЭРЫЯЛ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ШКОЛЕ

Навучанне беларускай мове ў сучаснай школе накіравана на практычнае авалодванне мовай, на выпрацоўку ўменняў і навыкаў розных відаў маўленчай дзейнасці чалавека. Але беларуская мова з’яўляецца і сродкам пазнання, развіцця і выхавання. Вось чаму ў задачы моўнай адукацыі ўваходзіць абуджэнне павагі да беларускага слова, да духоўнага багацця беларускага народа, што немагчыма без асвятлення пытанняў гісторыі беларускай мовы ўвогуле і пэўных пытанняў у прыватнасці. Так, пры паглыбленым вывучэнні беларускай мовы ў спецыяльных класах, на факультатыўных занятках, на курсах па выбару ўвагу вучняў варта скіраваць да гісторыі аднаго з іх. У межах артыкула прапануем матэрыялы для вывучэння ўласных імёнаў з улікам толькі адной групы – андронімаў у гісторыі ўзнікнення і паходжання антрапонімаў.

Цікавай з’явай у гісторыі славянскіх моў з’яўляюцца андронімы, пад якімі разумеюць назвы жонкі па мужу [1, с.29]. Напрыклад, андронімы тыпу *Михаловая, Шамранковая* абазначалі жанчыну, якая з’яўлялася жонкай мужчыны, імя якога *Михал*, прозвішча – *Шамранков*. Характэрна, што ў мінулым імя па мужу жонка захоўвала як пасля смерці мужа, так і пасля скасавання шлюбу. Такім чынам, іменем тыпу *Михаловая* маглі быць абазначаны: 1) жонка *Михала*, 2) жонка нябожчыка *Михала* і 3) былая жонка *Михала*.

Андронімы з’яўляюцца самастойнымі адзінкамі – субстантываванымі прыналежнымі прыметнікамі ў поўнай (членнай) форме і маюць “значэнне спецыфічнага імені па мужу” [2, с.108]. На поўныя формы такіх прыметнікаў указваў яшчэ А.А. Патабня: “… членнасць была адным са сродкаў субстантывацыі. Адсюль у стсл., у ц.сл. і рус. правіла, што жонка па мужу абазначаецца прыметнікам прыналежным членным” [3, с.401].

Багатай крыніцай даследавання андронімаў старабеларускай мовы з’яўляюцца помнікі старабеларускай дзелавой пісьменнасці, апублікаваныя ў серыі “Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией для разбора древних актов” у 39 тамах [4]. Дзелавыя дакументы, сабраныя ў актах, утрымліваюць значную колькасць онімнай і вытворнай ад яе лексікі, дакладна датаванай і тэрытарыяльна лакалізаванай, адлюстроўваюць найбольш аб’ектыўныя формы найменняў, у тым ліку і формы, абумоўленыя грамадска-палітычнай сітуацыяй.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ